# ВОПЫТ ПАДРЫХТОЎКІ ЖУРНАЛІСТАЎ У КАМУНІСТЫЧНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ БЕЛАРУСІ

**М. В. Прахарэня**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*prakhar@bsu.by*

У матэрыяле разглядаецца гістарычны вопыт падрыхтоўкі журналістаў на базе газетнага аддзялення Камуністычнага ўніверсітэта Беларусі імя У. І. Леніна. Вывучаецца механізм арганізацыі навучальнага працэса, яго практычнай накіраванасці.

***Ключавыя словы:*** журналісцкая адукацыя; газетнае аддзяленне; Камуністычны ўніверсітэт Беларусі.

# EXPERIENCE IN TRAINING JOURNALISTS AT THE COMMUNIST UNIVERSITY OF BELARUS

**M. V. Prakharenya**

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: M. V. Prakharenya (prakhar@bsu.by)*

The article examines the historical experience of training journalists on the basis of the newspaper department of the Communist University of Belarus named after V. I. Lenin. The mechanism of the organization of the educational process, its practical orientation is considered.

***Key words:*** journalism education; newspaper department; Communist University of Belarus.

Абвяшчэнне беларускай дзяржаўнасці, стварэнне і развіццё БССР у 1920-я гг. суправаджалася карэннымі зменамі ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці народа. Грамадскія пераўтварэнні былі немагчымы без падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў, у першую чаргу, спецыялістаў для партыйнага і дзяржаўнага кіравання. З гэтай мэтай у верасні 1920 г. была створана Цэнтральная савецка-партыйная школа Беларусі імя У. І. Леніна, якая ў кастрычніку 1925 г. была рэарганізавана ў Камуністычны ўніверсітэт

Беларусі імя У. І. Леніна (далей – Камвуз імя У. І. Леніна). Гэта навучальная ўстанова працавала ў Мінску ў перыяд з кастрычніка 1925 г. да верасня 1932 г. і рыхтавала кіруючыя кадры партыйных і савецкіх работнікаў. Атрымаць адукацыю можна было на такіх аддзяленнях, як партыйнае, савецкае, прапагандысцкае, народнай адукацыі.

Акрамя таго, у Камвузе імя У. І. Леніна функцыянавала газетнае аддзяленне, дзе рыхтавалі журналістаў, якія пасля працаўладкавання маглі ажыццяўляць кіраўнічыя функцыі і займаць пасады адказных рэдактараў, намеснікаў рэдактараў, адказных сакратароў, загадчыкаў аддзелаў рэдакцый раённых і цэнтральных газет БССР. На працягу некалькіх гадоў менавіта на газетным аддзяленні назапашваўся першы ў БССР вопыт падрыхтоўкі прафесійных журналісцкіх кадраў з вышэйшай адукацыяй.

Кантынгент навучэнцаў вызначаўся на самым высокім узроўні пры ЦК КП(б)Б. Як правіла, абавязковы крытэрый для паступлення ў Камвуз – партыйны (не менш за два гады) і працоўны (не менш за тры гады) стаж. Адзначым, што нягледзячы на складаную эканамічную сітуацыю ў краіне, падчас вучобы ва ўніверсітэце студэнты забяспечваліся жыллём і атрымлівалі значную матэрыяльную падтрымку з боку ўлады. Так, у 1927–1928 навучальным годзе нормы забеспячэння аднаго студэнта Камвуза складалі: харчаванне – 19 руб. у месяц; стыпендыя – 10 руб. у месяц; адзенне, кнігі, сшыткі і інш. – 53 руб. у год [2, с. 49].

Паводле вучэбнага плана газетнага аддзялення Камвуза імя У. І. Леніна, які захаваўся ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, агульная колькасць вучэбных гадзін для будучых кіруючых газетных работнікаў складала 3060. Навучальны год прадугледжваў 7 месяцаў заняткаў у аўдыторыі (па 9 гадзін штодзень) і 3,5 месяцы практыкі. Архіўныя матэрыялы дазваляюць зрабіць выснову, што ў першую чаргу перад студэнтамі ставілася задача авалодаць грамадска-палітычнымі дысцыплінамі, на выкладанне якіх адводзілася максімальная колькасць гадзін. Так, падчас аўдыторных заняткаў будучыя журналісты вывучалі такія прадметы, як савецкая эканоміка (320 гадзін), гісторыя і задачы Камінтэрна (240 гадзін), тэорыя партыі (180 гадзін), палітэканомія (150 гадзін), геаграфія пяцігодкі (100 гадзін), дыялектычны матэрыялізм (80 гадзін), матэматыка (100 гадзін), літаратура (80 гадзін). Акрамя таго, вучэбны план газетнага аддзялення прадугледжваў выкладанне наступных спецыяльных прафесійных дысцыплін: «Друк у сацыялістычным будаўніцтве» (280 гадзін), «Родная мова ў сувязі з мовай газеты» (280 гадзін), «Ленінскае вучэнне аб друку» (80 гадзін), «Тэхніка газетнай справы» (80 гадзін), «Гісторыя бальшавіцкага друку» (60 гадзін) [1, л. 58].

Як адзначае беларускі навуковец В. І. Якаўчук, перад савецкай сістэмай адукацыі стаяла прынцыпова новая задача: наладзіць цесную сувязь працэса навучання з жыццём. На думку савецкіх ідэолагаў, навучальныя ўстановы павінны былі рыхтаваць не адарваных ад рэальнасці тэарэтыкаў марксізма, а практычных спецыялістаў новага тыпу. Таму адным з асноваўтваральных метадаў ідэалагічнага выхавання і навучання студэнтаў з'яўлялася практыка [2]. Безумоўна, практыка студэнтаў газетнага аддзялення Камвуза імя У. І. Леніна цалкам адпавядала гэтым прынцыпам. Так, за перыяд навучання будучыя журналісты праходзілі практыку чатыры разы (па дзве практыкі тэрмінам 3,5 месяцы на кожным курсе). Першая практыка была прымеркавана да пачатку новага гаспадарчага года (студзень – люты) і праходзіла ў нізавым друку прадпрыемстваў г. Мінска. Задачай гэтай практыкі было навучыцца праводзіць партыйна-масавую работу на прадпрыемствах. Другая практыка праходзіла ў раёнах БССР і была прымеркавана да перыяду ўборкі ўраджая, падрыхтоўкі да азімага сева і хлебанарыхтоўкі. Далей, на другім курсе, студэнты праходзілі практыку ў цэнтральных газетах. Паводле праграмы, студэнт, які ўжо меў навыкі партыйна-масавай работы ў нізавых і раённых газетах, павінен быў атрымаць навыкі арганізацыі сектара ці аддзела ў цэнтральных выданнях, навучыцца рыхтаваць нумар да друку, весці асобныя тэматычныя рубрыкі. Асабліва падкрэслівалася, што да кожнага студэнта неабходны дыферэнцаваны падыход, улічваючы яго палітычную і агульнаадукацыйную кваліфікацыю. Апошняя практыка праводзілася зноў на базе раённых газет, падчас якой студэнты працавалі на пасадах намесніка рэдактара, загадчыка аддзела, адказнага сакратара.

Вынікі кожнай практыкі падводзіліся на спецыяльных канферэнцыях. Так, у 1930–1931 навучальным годзе на чарговай канферэнцыі прагучала крытыка аб недахопах у арганізацыі практыкі студэнтаў газетнага аддзялення. Практыканты скардзіліся на тое, што супрацоўнікі газет не праводзілі інструктажы, як апрацоўваць допісы, рабіць падборкі матэрыялаў. Адзначалася таксама нізкая кваліфікацыя мясцовых журналістаў. Даволі распаўсюджанай праблемай з'яўлялася тое, што падчас практыкі студэнты не атрымлівалі стыпендыю. Не кожная рэдакцыя, у сваю чаргу, мела сродкі для матэрыяльнай падтрымкі практыкантаў. У сувязі з гэтым студэнты былі вымушаны пакідаць месца практыкі раней пазначанага канчатковага тэрміну. Так, напрыклад, адбылося ў рэдакцыях газет Лепельскага, Рагачоўскага і Рэчыцкага раёнаў [1, л. 58].

Такім чынам, функцыянаванне газетнага аддзялення Камвуза імя У. І. Леніна – гэта першы вопыт падрыхтоўкі журналістаў у сістэме вышэйшай універсітэцкай адукацыі Беларусі. Нягледзячы на складаныя сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя умовы другой паловы 1920-х – пачатку 1930-х гг. тут быў закладзены падмурак для далейшай адукацыі журналістаў у перыяд актыўнага станаўлення нацыянальнай сістэмы друку. Так, менавіта на базе газетнага аддзялення Камвуза імя У. І. Леніна ў 1932 г. была створана першая профільная вышэйшая навучальная ўстанова Беларусі па падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў – Камуністычны інстытут журналістыкі, гісторыя якога падрабязна адлюстравана ў даследаваннях П. Л. Дарашчонка, Н. А. Зубчонак, А. Г. Слукі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Протоколы заседания Комиссии при Всебелорусском комитете по радиовещанию о проведении 1-й годовщины существования центральной радиопрессы БССР, документация Коммунистического университета им. В. И. Ленина (15 марта 1931 г. – 11 июля 1932 г.) // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 5458. Л. 58–60.
2. *Яковчук В. И.* Подготовка руководящих кадров в Коммунистическом университете Беларуси // Вышэйшая школа. 2017. № 1. С. 47–50.